**КАРОТКАЯ АНАТАЦЫЯ**
**«Гісторыя»**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Назва спецыялізаванага модуля | Гісторыя |
| 2. | Спецыяльнасць | 1-23 01 04 Псіхалогія<br>1-23 03 01 Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі<br>1-28 01 02 Электронны маркетынг |
| 3. | Курс навучання | 1 |
| 4. | Семестр навучання | 1, 2 |
| 5. | Працаёмкасць ў заліковых адзінках | 2 |
| 6. | Ступень, званне, прозвішча, імя, імя па бацьку выкладчыка | старшы выкладчык<br>Дзёміна Алена Яўгеньеўна |
| 7. | Мэта дысцыпліны | Фарміраванне сацыяльна-асобасных кампетэнцый студэнтаў, якія забяспечваюць іх самавызначэнне ў сістэме каштоўнасцей, выпрацаваных у працэсе гістарычнага развіцця беларускага народа і станаўлення суверэннай беларускай дзяржавы, і выхаванне на гэтай аснове пачуцця прыналежнасці да лёсу краіны і яе гісторыі. |
| 8. | Перарэквізіты | Гісторыя Беларусі |
| 9. | Змест дысцыпліны | Метадалагічныя асновы і прынцыпы вывучэння гісторыі, яе перыядызацыя. Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі. Пачатак рассялення славян па тэрыторыі Беларусі і славянізацыя балтаў. Усходнеславянская супольнасць. Сярэднявечча як асобны перыяд сусветнай гісторыі. Фарміраванне раннекласавага грамадства на тэрыторыі Беларусі. Станаўленне ранніх дзяржаўных утварэнняў усходніх славян на тэрыторыі Беларусі. Полацкае і Тураўскае княствы. Прынясце хрысціянства і распаўсюджванне пісьменнасці.<br>Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя перадумовы фарміравання ВКЛ. Фарміраванне дзяржаўнай тэрыторыі. Цэнтралізатарская палітыка і ўмацаванне ўлады вялікіх князёў. Крэўская унія. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх зямель у складзе ВКЛ. Сацыяльна-эканамічнае жыццё.Сацыяльна-палітычнае развіццё гарадоў. Магдэбургскае права. Знешняя палітыка ВКЛ.Асноўныя канцэпцыі паходжання беларускага народа, яго саманазвы. Фарміраванне беларускага этнасу і яго тэрыторыя ў XIV – XV стст.<br>Асноўныя тэндэнцыі развіцця сусветнай гісторыі ў Новы час. Люблінская унія і ўтварэнне Рэчы Паспалітай. Эканамічны і палітычны стан беларускіх зямель у XVII – XVIII ст. Асаблівасці фарміравання канфесійных адносін на тэрыторыі Беларусі ў XVI – XVII стст. Рэфармацыя і |

| | | |
|---|---|---|
| | | Контррэфармацыя. Брэсцкая царкоўная унія. Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай. Паглыбленне крызісу і тры падзелы Рэчы Паспалітай. Уключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі.<br>Роля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў гістарычным лёсе беларускага народа. Устанаўленне Савецкай улады ў Беларусі. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Стварэнне беларускай савецкай дзяржаўнасці.<br>Усталяванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР і яе асноўныя характарыстыкі.<br>Шляхі і метады будаўніцтва індустрыяльнага грамадства ў савецкай Беларусі. Станаўленне і развіццё савецкай беларускай культуры. Палітыка беларусізацыі.<br>Пачатак Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі.Устанаўленне акупацыйнага рэжыму, яго мэты. Баявая дзейнасць партызан і падпольшчыкаў. Пачатак вызвалення Беларусі. Аперацыя «Баграціён».<br>Вынікі вайны для беларускага народа і яго ўклад у Перамогу над фашызмам.<br>Пачатак “халоднай вайны”. Нарастанне пагрозы ядзернай вайны. Ваенна-палітычныя канфлікты 1950-1970 гг. Крызіс сусветнай сацыялістычнай сістэмы.Аднаўленне прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў пасляваенныя гады.<br>Пачатак перабудовы. Спробы рэфармавання эканомікі БССР на аснове гаспадарчага разліку. Чарнобыльская аварыя і яе наступствы. Эканамічны крызіс у СССР і БССР і яго праявы.<br>Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь. Пачатак фарміравання органаў улады і кіравання БССР на прынцыпах незалежнасці і суверэнітэту.Распад СССР і ўтварэнне СНД. Заканадаўча-прававое афармленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Канстытуцыйны працэс і прыняцце Канстытуцыі 1994 г. Выбары прэзідэнта і фарміраванне новай сістэмы ўлады. Распрацоўка і рэалізацыя беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага інавацыйнага развіцця краіны.<br>Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь. Выпрацоўка стратэгіі і прынцыпаў знешняй палітыкі. Беларуска-расійскія адносіны, стварэнне Саюза Беларусі і Расіі. Беларусь у СНД, стварэнне мытнага саюза і адзінай эканамічнай прасторы. Беларусь у АБСЕ і еўрапейскіх рэгіянальных структурах. Шматвектарнасць знешняй палітыкі, адносіны з Кітаем, ЗША, Беларусь і ААН. |

| | | |
|---|---|---|
| | | Адукацыя, навука і культура Рэспублікі Беларусь. Узаемаадносіны дзяржавы і царквы, адраджэнне рэлігійна-канфесійнага жыцця. |
| 10. | Рэкамендуемая літаратура | 1.Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай цывілізацыі: дапаможнік для студэнтаў / К. І. Баландзін, Дз. М. Хромчанка. - Мінск БНТУ, 2015. - 215 с.<br>2.Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі: кантрольныя заданні для студэнтаў негістарычных факультэтаў / Т. Ул. Апіок, В. В. Каляснёва. - Магілёў: МДУ, 2016. - 57 с.<br>3.Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі: вучэбны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў / П. І. Брыгадзін. - Мінск : Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, 2015. - 287 с.<br>4.Грамадска-палітычнае жыццё Вялікага Княства Літоўскага ў часы бескаралеўя 1733—1735 гг. / Андрэй Мацук. - Мінск: Беларуская навука, 2020. - 366 с.<br>5.Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пач.XXI ст.: у 2 кн. – Кн. 1 / А.А. Каваленя [і інш.]. Рэд. кал. А.А. Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2011. |
| 11. | Метады выкладання | Праблемны, наглядны, аналіза канкрэтных сітуацый (кейс-метад), эўрыстычны, даследчы, часткова-пошукавы |
| 12. | Мова навучання | Беларуская, руская |